Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Гародні працягваюцца рэпрэсіі дапоўнена

20.03.2017 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Марш недармаедаў у Гародні 15 сакавіка

У Гародні сілавыя структуры працягваюць пераслед актывістаў і ўдзельнікаў акцыі пратэсту, якая прайшла ў горадзе 15 сакавіка.

Па інфармацыі Беларускага Радыё Рацыя, увечары 19 сакавіка стала вядома, што міліцыя пачала яшчэ дзве адміністрацыйныя справы ў дачыненні да прысутных на мірным сходзе ў Дзень Канстытуцыі ў Гародні 15 сакавіка.

Гарадзенскаму грамадскаму актывісту і праваабаронцу **Эдварду Дмухоўскаму** тэлефанаваў старэйшы лейтэнант Аляксей Вайцешка і паведаміў, што на яго складзены адміністрацыйны пратакол па ч.3 арт. 23.34 КаАП. Яшчэ раней позву ў Ленінскі РАУС на 10 гадзін раніцы 20 сакавіка атрымаў гарадзенец **Віталь Дзюк**. 15 сакавіка ён быў на плошчы Гародні з бел-чырвона-белым сцягам. На дзень раней паведамілі пра новыя адміністрацыйныя пратаколы **Антону Вайцехаву і Мікалаю Саляніку**, якіх ужо судзілі 14 сакавіка і засудзілі да штрафаў. Да Мікалая Саляніка міліцыянты прыехалі ў шпіталь, дзе ён ляжыць з пнеўманіяй. Калі адбудзецца новы суд над пенсіянерам, які выступаў на плошчы 15 сакавіка, у такой сітуацыі невядома.


Каля 19 гадзінаў вечара, ў нядзелю, старэйшы лейтэнант міліцыі Аляксей Вайцешка разам з калегам (імя якога не ўдалося высветліць) з прад'яўленнем пасведчанняў спрабавалі забраць яго з аддзялення бальніцы. Мікола Салянік распавёў пра візіт міліцыянтаў: – Я хворы чалавек, знаходжуся на лячэнні, і ні з кім размаўляць не буду. Хочаце, забірайце мяне гвалтам але забяспечце мне ўмовы. У мяне запаленне лёгкіх, мне патрабуецца лячэнне ў стацыянары. Калі вы будзеце настойваць, то майце на ўвазе, што я прымаю і псіхатропныя лекі, я за сябе адказваць не магу і магу аказць фізічны супраціў. На думку Міколы Саляніка, міліцыя спрабуе ізаляваць яго перад 25 сакавіка. Цяпер актывіст праходзіць лячэнне ад пнеўманіі ў аддзяленні пульманалогіі першай гарадской бальніцы Гародні.


Чытай больш на: http://www.racyja.com/hramadstva/u-garodni-militsyyanty-khatseli-zabrats-p/

Нагадаем, што 14 сакавіка ў Гародні адбылося 12 карных працэсаў па адміністрацыйных справах грамадскіх актывістаў за ўдзел у маршы недармаедаў, які прайшоў у Гародні 19 лютага. Трое з падсудных – Вадзім Саранчукоў, Ежы Грыгенча і Сяргей Верамеенка былі засуджаны да адміністрацыйнага арышту ад 13 да 15 сутак, іншыя – аштрафаваныя. А 16 сакавіка на 13 сутак адміністрацыйнага арышту ў Гародні зняволілі Аляксандра Лаўрэнцьева.

Твитнуть







СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ


Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO




ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Шлях да "Вясны". Як прыходзяць да праваабароны – новы выпуск падкаста

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

